

Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Пейджинговую связь редакции обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис". ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№18 (204). 3 — 9 траўня 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 130 руб.



И ЦЕНЫ ОТПУСТЯТ, И ПОМОЩЬ ДАДУТ

К концу этого года в Беларуси может существенно сократиться количество регулируемых цен.

О такой перспективе сказал премьер-министр Владимир Ермошин в беседе с журналистами в ходе своего недавнего рабочего визита в Могилевскую область.

По словам премьера, введение свободного ценообразования не должно проводиться в отрыве от уровня доходов населения, поэтому некоторые цены все же будут оставаться под контролем государства. Владимир Ермошин считает, что к концу этого года в Беларуси останутся регулируемыми тарифы на услуги коммунального хозяйства, транспорта, цены на продукцию монополий, в частности, электроэнергию. Остальные цены, отметил глава правительства, должны быть рыночными.

Относительно аграрной проблемы премьер-министр сказал, что реформирование отечественного сельского хозяйства должно начинаться "снизу". По его мнению, центральная власть подготовила все необходимые документы, создала условия для проведения сельской реформы. Это дает возможность районным властям вместе с людьми, работающими на земле, избрать при необходимости любую форму хозяйствования для существующих колхозов — частную, кооперативную, общество с ограниченной ответственностью, предприятие, коллективное хозяйство и т.д. Что касается убыточных хозяйств, то здесь, как считает Ермошин, государство должно позаботиться о временном освобождении новых сельских предприятий от долгов, мешающих им работать. "Мы готовы пойти на такие условия, несмотря на то, что это очень тяжело для бюджета", — заявил Владимир Ермошин.

В то же время, в 2002 году общая помощь государства белорусскому селу возрастет до триллиона рублей, отметил премьер-министр Беларуси Владимир Ермошин. В нынешнем же году, по его словам, сельское хозяйство получит помощь в размере более 600 миллиардов рублей.

Владимир Ермошин отметил, что сельским хозяйствам надо выходить на самоокупаемость, выручка должна покрывать затраты на выплату заработной платы, создавать оборотные средства. Государственная поддержка в таком случае будет работать на перспективу развития сельского хозяйства, а бюджет страны превратится из "производственного" в "социальный". Пока же дефицит республиканского бюджета, по словам премьер-министра, составляет около 480 миллиардов рублей. Он будет перекрываться за счет сокращения расходов и увеличения объема производства товаров.

БелаПАН

МИЛЛИАРДНЫЙ ДОЛГ

Ожидается, что сумма государственного долга Беларуси в течение года возрастет примерно на 65 миллионов долларов США и к концу 2001 года приблизится к 930 миллионам долларов США.

Такой прогноз содержится в меморандуме об экономической и финансовой политике на период с 1 апреля по 30 сентября 2001 года, одобренном правительством Беларуси, Национальным банком и Международным валютным фондом.

В меморандуме констатируется, что внешнее финансирование в 2001 году будет по-прежнему ограничено. При этом погашение внешнего долга составит примерно 80 миллионов долларов США, включая возврат кредитов МВФ — 31 миллион долларов США. Во втором квартале существенное давление на бюджет будет в некоторой степени ослаблено благодаря получению первого транша в сумме 30 миллионов долларов США из среднесрочного кредита России, за которой ближе к концу года проследуют остальные 70 миллионов долларов США. В связи с этим и другими небольшими кредитами, правительство и Нацбанк Беларуси ожидают увеличения на конец года государственного долга до вышеназванной суммы.

Вместе с тем, правительство заявляет, что намерено выполнять все внешние обязательства в 2001 году и при этом не допускать дальнейшего накопления просроченной задолженности по внешним платежам, особенно по платежам за импорт энергоносителей.

БелаПАН

ПО МАШИНАМ!

Постановлением Министерства транспорта и коммуникаций с 28 апреля в Беларуси на 7,3 процента повышены тарифы на перевозку пассажиров легковыми такси.

Стоимость одного километра пробега и посадки в такси в дневное время (с 6 до 22 часов) составляет 295 рублей (было 275), одного часа простоя при включенном таксометре — 2.950 рублей (2.750). Километр проезда и посадка в такси в ночное время (с 22 до 6 часов) обойдется пассажиру в 440 рублей (410), а час простоя при включенном таксометре — в 4.400 рублей (4.100).

Впервые в постановлении Минтранса определена стоимость заказа такси: 200 рублей — в дневное время и 300 рублей — в ночное.

После одномесячной забастовки слонимские таксисты с 1 мая возобновили свою деятельность. Гродненский облисполком так и не пошел им на уступки и не снизил ставку подоходного налога, который составляет 6 минимальных заработных плат (34 200 руб.).

Дмитрий ВЛАСОВ, Ольга ШИНКЕВИЧ

Уважаемые читатели "Газеты Слонімскай"!

С сегодняшнего номера мы открываем для вас новую рубрику под названием: "По секрету всему свету". Любой желающий может высказаться, позвонив на пейджер по телефону 8-22-73-00-00, для абонента 95196.

Наш первый вопрос: "Какой ценный совет вы получили в своей жизни?". Не забудьте указать свое имя, возраст, место жительства. Ведущая рубрики корреспондент Ольга ШИНКЕВИЧ

ПИКЕТ МЕДИКА

Житель Гродно Михаил Ещик подал на имя председателя горисполкома заявление с просьбой разрешить ему провести пикет возле областного управления здравоохранения, которое находится в здании Гродненского облисполкома.

Михаил Ещик, работающий инженером-наладчиком унитарного предприятия "Медик", собирается пикетировать управление с плакатом "За обслуживание лечебных учреждений — своевременную выплату заработной платы". Свои действия он обосновывает тем, что областное управление здравоохранения постоянно задерживает перечисление денежных средств за выполненные "Медиком" работы. В результате этого 370 сотрудникам предприятия задерживается зарплата: так, на 27 апреля еще не была выплачена зарплата за март. Кроме того, по словам Михаила Ещика, начиная с января этого года, месячная зарплата работникам предприятия выплачивается в три этапа, по мере поступления денег.

Павел МОЖЕЙКО

АДКРЫТАЕ ПІСЬМО

мэру горада Слоніма Лакцюшыну А.М., загадчыку аддзела адукацыі Слонімскага гарвыканкама Бумагіну А.Р.

Паважаныя Алег Мікалаевіч і Аркадзь Рафаэлавіч, мы, калектыў СШ №2 з музычна-харавым і агульнаэстэтычным ухілам г. Слоніма, звяртаемся да вас з просьбай растлумачыць нам, чаму на працягу апошніх месяцаў мы не атрымліваем своечасова свой заробак. Нават калі і даяце нам тыя грашовыя крохі, то часткамі. Прабачце за такое параўнанне: "кідаеце, як сабакам костку". Няўжо вы лічыце, што калі нам дадуць 5000 або 10000 рублей на тыдзень або два, дык за гэтыя грошы можна пражыць? Вы самі спрабавалі? Напрыклад, каб купіць бутэльку малака, хлеба, батон, трэба аддаць у магазіне 1000 рублёў. Ці вы ў магазіны не ходзіце? У нас у калектыве шмат адзінокіх маці, якім няма чым накарміць сваіх дзяцей. Як галоднаму дзіцяці растлумачыць, чаму маці, якая цэлы дзень знаходзіцца на працы, не можа яго накарміць, не гаворачы пра іншае. З якім настроем можа прыходзіць настаўнік у клас, калі ў яго няма ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. А вы яшчэ патрабуеце, каб яны прыгожа апраналіся, давалі ўрокі на высокім узроўні, былі наватарамі.

Просім вас праз "Газету Слонімскую" даць адказ на нашы пытанні і выправіць становішча, у якое вы нас паставілі. Колькі ж будуць настаўнікі і медыкі хадзіць да вас з працягнутай рукой?

Чак Г.Г., Міско Е.З., Даражук С.Д., усяго - 82 подпісы.

У Слоніме адзначылі чарговае свята

На свята працы і вясны ў Слоніме сабралася не шмат народу. Яно і зразумела — свята святам, а правесці яго на дачы ці агародзе — карысці болей, бо "вясновы дзень год корміць"...

Тым не менш, на плошчы Леніна, дзе праходзіў мітынг, сабралася каля трохсот чалавек. З кароткімі прамовамі выступілі старшыня гарвыканкама Алег Лакцюшын і Іван Чаус, камандзір 11 механізаванай брыгады. Воіны гарнізона прайшлі ўрачыстым маршам, і ... усе разышліся па сваіх справах.

Валерый КАВАЛЕНКА



Фота Віталя Гіля

ПРЭМ'ЕРА

ПЕРШЫМ ГЛЕДАЧОМ ФІЛЬМА БЫЎ ЛУКАШЭНКА, ДРУГІМ – СЛОНІМЦЫ

Аб гэтым сказаў рэжысёр фільма "У жніўні 44-га" народны артыст Беларусі Міхаіл Пташук на сустрэчы, якая адбылася ў слонімскім кінатэатры "Мір" у суботу, 28 красавіка.


Міхаіл ПТАШУК

Перад пачаткам фільма Міхаіл Пташук падзякаваў кіраўніцтва і жыхароў горада Слоніма за дапамогу, аказаную пры здымках фільма. У сваім выступленні рэжысёр сказаў, што фільм у Мінску пачне дэманстравацца толькі з 6 траўня, а 4 траўня ў Маскве, у кінатэатры імя Пушкіна, яго паглядзіць прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

– У Слоніме мы амаль поўнасцю знялі гэты фільм, але свайго горада вы не пазнаеце,– адразу прызнаўся слонімцам Міхаіл Пташук. Далей з яго вуснаў ліўся сум па Савецкім Саюзе, адмоўна выказваўся рэжысёр у адрас амерыканскага кіно. Ён таксама зазначыў, што ў свеце ніхто не ведае Беларусь, што фільм быў вельмі цяжкі з боку фінансавання, але, дзякуючы расійскім фундатарам, кінакарціна ўсё ж з'явілася на экране.

Потым паглядзелі фільм "У жніўні 44-га" па раману Багамолава "Момант ісціны". Вядома, кожны застаўся пры сваёй думцы. Асабіста мне, шчыра кажучы, фільм не спадабаўся. Ад фільма, на стварэнне якога было патрачана некалькі мільёнаў даляраў, я чакаў большага. Калі пачатак фільма пачынае інтрыгаваць, зацікаўліваць гледачоў, якія спадзяюцца на нейкую арыгінальную развязку падзей, то сярэдзіна фільма поўнасцю правалілася, яна аказалася зацягнутай і сумнай. Ды і ў фінале хацелася б убачыць своеасаблівую рэжысёрскую навізну, задумку, каб, сапраўды, здзівіць, даказаць, што фільм варты нашага часу. Не атрымалася. Сам рэжысёр Міхаіл Пташук у канцы свайго выступлення сказаў, што крытыка ўжо пісала пра яго фільм, як пра звычайны савецкі фільм пра вайну. Рэжысёр, вядома, з гэтым не згаджаецца. Але факт застаецца фактам.

Мая шаснаццацігадовая дачка, паглядзеўшы гэты фільм, задала мне адразу пытанне: "За што забілі ў канцы фільма гэтых прыгожых маладых хлопцаў? За тое, што яны перадавалі па рацыі? Я не зразумела..."

Кінафільм "У жніўні 44-га"– антыбеларускі фільм. Ці не лепш было б рэжысёру за гэтыя ж грошы зняць фільм пра Вітаўта, Рагнеду, Касцюшку, Каліноўскага, як гэта зрабілі, напрыклад, палякі, ці робіць Мікіта Міхалкоў у Расіі...

На развітанні слонімцы запыталі ў Пташука, калі ён зноў прыедзе ў Слонім здымаць кіно.

– Прыеду тады, калі ў вашым горадзе будзе пабудавана новая гасцініца, – сказаў рэжысёр фільма.

Сяргей ЧЫГРЫН


Кадр з кінафільма "У жніўні 44-га"

НАВІНЫ

Чарнобыльскі шлях — 2001

26 красавіка з 17.00 да 18.00 Слонімская Рада БНФ з дазволу гарвыканкама ладзіла пікет Чарнобыльскі шлях, на якім было раздадзена шмат улётак: "Рабочы", "Права на волю", "Навіны", "Веснік", Дэкларацыя правоў чалавека, каляндарыкі. Збіраліся подпісы пад рэзалюцыяй.

Мінула 15 гадоў з трагічнага дня. Надыходзіць пік розных захворванняў, выкліканых радыяцыяй. Але улады ўсяляк стараюцца супакоіць нас, маўляў, усё добра і няма вялікіх праблем ад радыяцыі. На самай справе становішча з кожным годам усё горшае. Таму шмат у здароўі людзей залежыць ад медыцынскага абслугоўвання. Возьмем, напрыклад, Слонім, дзе медыцына ў заняпадзе, бо фінансуецца значна горш, чым дзесяць гадоў таму. Не хапае лекаў, шпрыцоў, сістэм для пералівання, мяккага інвентару, няма рэнтгенаўскай плёнкі. А як без яе выявіць анкалагічныя захворванні на ранніх стадыях. Затрымліваецца заробак медыкам, нават той мізэрны, які налічваецца. І такое становішча не толькі ў медыцыне, а паўсюдна.

А як купіць лекі за тыя грошы, якія плоцяць людзям за працу? Як выжыць у гэтых умовах? Як жыць далей нам і нашым дзецям ды ўнукам?

Іван БЯДКО, старшыня слонімскай Рады БНФ "Адраджэньне"

Тэатральны семінар

У Слонімскім РДК адбыўся раённы семінар на тэму "Тэатральная Слонімшчына".

У ім прынялі ўдзел культработнікі горада і раёна, а таксама артысты мясцовага беларускага драмтэатра. Тэатралы паказалі ўрывак са спектакля "Жаніцьба Бальзамінава".

Слонімскі краязнаўчы музей прадэманстраваў невялікую выставу, якая расказвае пра гістарычны шлях тэатральнага мастацтва на Слонімшчыне ад часоў Міхала Агінскага да сённяшніх дзён.

Сяргей ЧЫГРЫН

Тянут провода

Правоохранительные органы Гродненской области считают необходимым активизировать свою работу по предупреждению краж цветных металлов с линий электропередач.

По информации пресс-центра УВД Гродненского облисполкома, количество краж цветных металлов в области в последние месяцы увеличилось. Сотрудники милиции связывают это с ростом мировых цен на цветные металлы. Так, например, 20 марта РОВД Щучинского и Волковысского районов возбудили уголовные дела по фактам краж алюминиевых проводов с линий электропередач. В частности, с обесточенной линии электропередач у деревни Макеевцы Щучинского района в течение ноября 2000 – апреля 2001 года неизвестными были украдены 560 метров алюминиевого провода. Потери, нанесенные государству, составили 250 тысяч рублей. В Волковысском районе, у деревни Новоселки, неизвестные украли с электролиний алюминиевый провод на общую сумму около 300 тысяч рублей.

Павел МОЖЕЙКО

ЗДАРЭННІ

Загубіў сам сябе

У мінулыя святочныя дні здарылася трагедыя ў адной слонімскай сям'і.

Падлетак, вучань 10 класа СШ №8, скончыў жыццё самагубствам, ён павесіўся.

Што стала прычынай суіцыду, пакуль невядома.

Зладзейства па-ранейшаму пануе

- У жыхаркі вёскі Васілевічы Слонімскага раёна раней судзімы ўкраў з дому 22 бутэлькі гарэлкі.
- У вёсцы Жыровічы зніклі чатыры курыцы. Вядзецца праверка.
- Са збожжасклада ў вёсцы Шылавічы мужчына ўкраў зерне.

Міліцыя злодзея затрымала.

Сяргей ЧЫГРЫН

Нападзенне на "Энцы"

27 красавіка каля 15 гадзін на вуліцы Косаўскі тракт у Слоніме было ўчынена нападзенне на дзвюх школьніц 14-ці і 15-ці гадоў.

Калі адна дзяўчынка заходзіла ў пад'езд дома, яе схапіў мужчына ва ўзросце каля 30-ці гадоў і пачаў душыць. Дзяўчынка страціла прытомнасць у той час, калі сяброўка спускалася па лесвіцы ўніз і ўбачыла, што адбываецца. Злачынца пакінуў сваю ахвяру і пусціўся даганяць міжвольную сведку. Але, на шчасце, дома ў гэты час былі бацькі дзяўчынкі. Яны кінуліся ў пагоню за злачынцам. Ужо на вуліцы да іх далучыліся іншыя жыхары мікрараёна. Мужчыну злавілі і перадалі міліцыі. Ім аказаўся мясцовы жыхар А.

Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

Мікола КАНАНОВІЧ

"МАНІФЕСТ" І "NOTE BENE" ДЫПЛАМАВАНЫ

У Лідзе прайшоў другі абласны музычны фестываль "Фантазіі вясны 2001".

У ім прынялі ўдзел прадстаўнікі 12 раёнаў вобласці, гарадоў Гродна і Ліды. Прысутнічалі госці з Масквы. Спрачаліся між сабою салісты, танцавальныя калектывы, вакальна-інструментальныя групы ды эстрадныя калектывы. Пасля папярэдніх адбораў, з 200 калектываў у конкурсе прыняло ўдзел звыш 40. Масты прадстаўлялі два калектывы: гурт "Маніфест" пад кіраўніцтвам Валерыя Бакуна ў намінацыі вакальна-інструментальныя калектывы і эстрадна-інструментальны гурт "NOTE BENE", які ўзначальвае Віктар Качан. Мастаўчане выступілі ўдала. Іх не толькі цёпла сустрэлі гледачы, але і адзначыла журы. Абодва калектывы сталі дыпламантамі конкурсу.

ЭНЕРГЕТЫКІ ПАЧЫНАЮЦЬ ЗМАГАННЕ

На мінулым тыдні мастоўскія энергетыкі адключылі будынак Азёркаўскага сельсавета за сістэматычную няўплату за карыстанне электраэнергіяй. Праўда, пакараць мясцовую ўладу ім не ўдалося.

Паколькі ў адным з сельсаветаўцамі будынку знаходзіцца сельская тэлефонная станцыя, то сувязісты хутка адшукалі прычыну "знікнення" электрычнасці. Энергазабяспячэнне сувязі было неадкладна адноўлена, адначасова атрымаў святло і сельсавет.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ИДЕТ ПРИЗЫВ НА СЛУЖБУ

Явке на призывной участок Слонимского района для призыва на срочную службу подлежат граждане 1983 года рождения, которым ко дню призыва исполнилось 18 лет, а также граждане, родившиеся в 1974-1982 г.г., у которых истекли отсрочки от призыва или не призванные ранее на срочную военную службу по различным причинам.

Все граждане, подлежащие призыву на срочную военную службу в Вооруженные Силы и другие воинские формирования Республики Беларусь обязаны прибыть на призывной участок по адресу: г.Слоним, ул. Пушкина, 52, точно в назначенные дни и часы с документами, указанными в повестке. Граждане, не получившие повесток о явке для призыва на срочную военную службу, обязаны прибыть в городской военный комиссариат в течение месяца со дня выхода Указа Президента, имея при себе документы, удостоверяющие личность.

Все лица призывного возраста, подлежащие призыву на срочную службу, временно проживающие на территории Слонимского района и города, обязаны незамедлительно возвратиться к месту постоянного жительства и явиться в районный военный комиссариат, в котором они состоят на воинском учете для прохождения призывной комиссии.

Граждане, не явившиеся своевременно для призыва на срочную военную службу или уклоняющиеся от явки на призывной участок, несут ответственность согласно действующего законодательства.

Александр КУПКА, слонимский городской военный комиссар

ЗДАРЭННІ

Недарэчная смерць

У вёсцы Вялікія Сцяпанішкі Мастоўскага раёна 50-гадовая жанчына забіла 30-гадовага мужчыну.

Яна стукнула яго звычайным тазікам. Удар прыйшоўся ў скроню і стаў смяротным. Паколькі следства толькі распачата, то нельга назваць канкрэтна матывы ўчынку жанчыны. Тым не менш, як сцвярджаюць суседзі, мужчына спачатку ўкраў у яе тазік, а потым вырашыў аддаць. Кабета тазікам жа і паквіталася. Ці так яно ці не было на самай справе, высветліць следства.

Антон МАКЕЙ

Аммиак в Городничанке

Специалисты экологических служб Гродно проводят расследование случая утечки аммиака, который привел к гибели флоры и фауны водоема Гродненского зоопарка.

Утечка вредного химического вещества в реку Городничанка произошла 25 апреля с предприятия "Торгмаш", которое находится недалеко от зоопарка. Благодаря проведенным оперативным мероприятиям экологам удалось остановить процесс гальваники, который и стал причиной утечки аммиака.

По словам специалистов, концентрация аммиака в речке была очень малая, поэтому никакого вреда Неману, притоком которого является Городничанка, не нанесено. Как отметила директор Гродненского зоопарка Целина Пагерила, на сегодняшний день вода бассейна в зоопарке очищена; птицы, которые также подверглись воздействию аммиака, чувствуют себя нормально.

Павел МОЖЕЙКО

СПЯШАЙЦЕСЯ РАБІЦЬ ДАБРО

Пад такой назвай 25 красавіка ў вялікай зале РДК прайшоў дабрачынны канцэрт Слонімскай дзіцячай музычнай школы.

Трэба адзначыць, што першы такі канцэрт адбыўся дзевяць гадоў назад. З таго часу ідэйным натхніцелем і арганізатарам усіх канцэртаў з'яўляецца загадчыца справамі райвыканкама Лізавета Мукасей, а рэжысёрам-пастаноўшчыкам і вядучай — выкладчыца музычнай школы Марына Шымчык.

Сродкі, сабраныя на канцэртах, пералічваюцца хворым дзецям, інвалідам Чарнобыля і маламаёмасным пажылым людзям. Сёлета арганізатары распаўсюдзілі 600 квіткоў коштам па 500 рублёў. Сабраныя сродкі будуць перададзены дзіцячаму аддзяленню раённай бальніцы.

Пачаў праграму хор "Камерата" пад кіраўніцтвам канцэртмейсцера Зоі Чысцяковай. Затым з рознымі нумарамі выходзілі на сцэну ансамбль "Арфеон" (мастацкі кіраўнік Аляксандр Масляніцын), тэатр узорнага танца "Каскад" (кіраўнік Зоя Пятроўская), камерны ансамбль (кіраўнік Таццяна Бойка), дзіцячы танцавальны ансамбль "Карапузы", ансамбль "Настальжы", а таксама салісткі Ала Кузняцова, Валянціна Жалязнякоўская, Алена Растачылава і Рыта Барташэвіч. Як і кожны год, усю асноўную праграму канцэрта падрыхтавалі настаўнікі і вучні дзіцячай музычнай школы. Іх падтрымалі аркестр рускіх народных інструментаў і народныя ансамблі "Рабіначка" і "Грымата".

Мікола КАНАНОВІЧ, фота Віталя ГІЛЯ



Выступае тэатр узорнага танца "Каскад"



На сцэне — дзіцячы танцавальны ансамбль "Карапузы"

ПОШТА

Помогли разрешить проблему

Здравствуйте, уважаемая редакция "ГС"!



Пишут вам жители деревень Озерница, Драпово, Мыслово, Клепачи. Мы обращаемся к вам с просьбой решить одну проблему. Дело в том, что у нас есть железнодорожная станция "Озерница", где проходят поезда Минск — Гродно, Гродно — Минск. Раньше оттуда можно было уехать, куда захочешь, а теперь — нет. В кассе станции "Озерница" билетов не продают, и там нет посадки. Сейчас, чтобы куда-нибудь уехать, нужно добираться за билетами в Слоним. Это ведь так неудобно многим людям. Помогите, пожалуйста, нам разрешить эту проблему.

Жители деревень Озерница, Драпово, Мыслово, Клепачи:

Шестак В.А., Радевич В.К., Жолудь Л.И., всего 45 подписей

Чтобы выяснить ситуацию, корреспондент "ГС" обратилась к начальнику Барановичского отделения белорусской железной дороги Сергею Ивановичу Кургузу.

Через некоторое время редакция получила ответ. "Ваше обращение по вопросу организации продажи билетов на станции Озерница на п\п №616\615 сообщением Гродно — Минск — Гродно рассмотрено в отделении дороги.

Остановка по станции Озерница пассажирскому поезду №616\615 в сообщениях Гродно — Минск, Минск — Гродно не отменялась.

До настоящего времени билеты на поезд №616\615 не продавались, но, проанализировав пассажиропоток и доходы, полученные от продажи проездных документов, а также, учитывая неоднократные обращения, поступившие от пассажиров, принято решение: с 20.04.2001 года продажу проездных документов на п\п №616\615 по станции Озерница производить начальниками поездов", — отметил в своем письме, адресованном в редакцию "ГС", Сергей Кургуз.

Подготовила Ольга ШИНКЕВИЧ

Кто покалечил "Медвежат"?

Здравствуйте, редакция "ГС"! Пишу вам вот по какому поводу: неизвестные вандалы покалечили морды медведям, которые встречают около Новой Стражи всех въезжающих в Слоним со стороны Баранович.

По-моему, это изваяние из камня было одним из символов вашего города, и мне больно смотреть, что оно испорчено. Ведь "Медвежата" стояли много лет. Думаю, что вполне возможно восстановить их первоначальный вид силами местных художников или учащихся Слонимской художественной школы. Если нужны деньги, то пишите, сколько и кому передать. Я готов помочь.

Андрей ЖУЛТАК, e-mail: zhultak@belcustoms.com

послание работникам правоохранительных органов

Решила я написать это послание после небольшого недоразумения, с которым я и еще трое родителей столкнулись.

Значит так, вызвали наших детей (им по 15-16 лет) в военкомат. После комиссии один из них купил своему старшему брату пиво, 1,5 литровую бутылку. У ребят было полчаса свободного времени, и они сели отдохнуть в сквере на набережной. Тот, который купил пиво, предложил его попробовать. И они вчетвером сделали несколько глотков (в общей сложности - 300 грамм) из этой бутылки. Потом, закрыв пиво, стали собираться к автобусу, который ждал их в 12 часов возле банка. В это время к ним подошли переодетые сотрудники милиции и стали предъявлять им претензии за распитие спиртных напитков. Хочу заметить, что наши дети вели себя более чем достойно: просили отпустить их, так как они из деревни и опаздывают на автобус. Ребят стали запугивать наручниками. Потом, как полагается "добросовестным" работникам милиции, отвели подростков в отделение. Там, естественно, на них составили протокол и вызвали на следующий день родителей. Нам прочитали лекцию о том, что несовершеннолетним детям не положено распивать спиртные напитки. И если пиво еще год назад не считалось алкогольным напитком, то сейчас считается. Нам сказали, что родители должны нести ответственность за своих детей. Да, я с этим согласна: мы отвечаем за поступки своих детей, но, в нашем случае, можно было бы отнестись к этому инциденту проще, не доставлять себе лишней писанины. Или, может, наших сотрудников именно такие нарушения устраивают, а более серьезные случаи они могут и не заметить? Надо уметь оценивать обстановку, личность и отличать распитие спиртных напитков от глотка. Скажете, все начинается с глотка, а я вам отвечу: "Нет! С человеческих отношений". Можно было бы припугнуть и отпустить этих подростков. Вы бы заслужили, я в этом уверена, уважение и веру в нашу милицию.

Хочу сказать, и многие, я думаю, со мной согласятся, что ни одна исправительная колония, ни одна тюрьма не сделала заключенных лучше. А кто в этом виноват? Подумайте, может надо быть добрее, честнее и добиваться результатов не силой и властью, а умом и порядочностью?

Подростковый возраст - самый трудный, и я не хочу, чтобы в воспитание моих детей вмешивалась милиция. Надо быть, в первую очередь, психологами, что милиции не присуще. Хотя, если бы в отделе был хоть один психолог и давал советы детям с мелкими нарушениями "законов", я думаю, что у отделения милиции меньше было бы расходов на канцелярские товары.

Мне сейчас страшно отпускать своих детей одних: вдруг какое-то слово или жест покажутся нашим сотрудникам правопорядка непристойными.

Поэтому я хочу обратиться к сотрудникам милиции: уважаемые, чтобы заслужить уважение к себе, вам нужно самим его излучать. Даже по отношению к преступникам!

Светлана ВЕСЕЛОВА, д.Селявичи

ЗА КОММЕНТАРИЕМ ПО ЭТОМУ ПИСЬМУ КОРРЕСПОНДЕНТ "ГС" ОБРАТИЛАСЬ К ЗАМЕСТИТЕЛЮ НАЧАЛЬНИКА СЛОНИМСКОГО ГРОВД ИВАНУ ИВАНОВИЧУ МЕЛЕШКО.

"Пиво для подростков (дети до 18 лет) всегда считалось алкогольным напитком, — сказал Иван Иванович. – На сегодняшний день 4 продавца были привлечены к административной ответственности за продажу спиртных напитков несовершеннолетним. В случае, если сотрудниками правоохранительных органов был засвидетельствован факт распития спиртного несовершеннолетними, они просто обязаны привлекать родителей или лиц их заменяющих, согласно статье 159 (распитие спиртных напитков в общественных местах или появление в общественных местах в пьяном виде) части 4 Кодекса об административных правонарушениях РБ к ответственности, что влечет за собой наложение штрафа в размере до 2-х минимальных заработных плат. За 4 месяца текущего года за нарушение антиалкогольного законодательства привлечено 37 подростков, из них по ст. 159, части 4 — 17 человек. Находясь в алкогольном опьянении, подростки совершают преступления. В текущем квартале 3 несовершеннолетних совершили уголовно наказуемые преступления. Родители должны задуматься над этим. По статье 160 (доведение несовершеннолетних до состояния опьянения) Кодекса об административных правонарушениях РБ привлечено 23 взрослых, которые покупали или наливали несовершеннолетним алкогольные напитки. В этом случае налагается штраф в размере от 5 до 10 минимальных заработных плат. Милиционеры – исполнители закона, а законом предусмотрена ответственность за его нарушение. И от этого никуда не деться".

Подготовила Ольга ШИНКЕВИЧ

НАВІНЫ

ВОСЬМАЯ ШКОЛА выходит в интернет

Хочу рассказать об организации, которая действует в интернете. IEARN — международная образовательная и информационная сеть. Центральный офис её находится в Нью-Йорке, а отдельные представительства — в каждой стране. Эта организация предоставляет для участия множество разнообразных проектов.

СШ №8 является активным участником IEARN. Инициативную группу в ней представляет 8 "Е" класс этой школы. Координаторами проектов являются Демьянова Валентина Васильевна и Якубейко Элла Анатольевна. Учащиеся нашей школы участвуют в проектах: "День моей жизни", "Холокост и геноцид", "A Vision", "Аспекты любви", "Лица войны" и "Рисуем нашу планету". Каждый из проектов интересен по-своему, т.к. даёт возможность проявить самые разные таланты. Вообще, цель этих проектов— способствовать общению и сотрудничеству людей всего мира учить высказывать свою точку зрения, ценить и уважать мнение других.

Недавно в СШ №8 приезжали координаторы IEARN: из Гродно — Валентина Суворина, из Волковыска — Светлана Хаванова, координатор IEARN в Нью-Йорке — Марина Михайлова. Они подробно рассказали о работе IEARN, а также познакомились с результатами нашей работы. Вклад учащихся нашей школы в развитие IEARN получил очень высокую оценку.

Олеся КАХНОВСКАЯ, ученица 8 класса СШ № 8 г.Слонима



Участники IEARN СШ №8

ПОХИТИТЕЛЕЙ БУДУТ СУДИТЬ

Суд над похитителями оператора ОРТ Дмитрия Завадского может состояться уже в конце мая. Как заявил газете "Время новостей" пресс-секретарь прокуратуры Белоруссии Алексей Таранов, дело "находится в стадии завершения", и в начале мая будут обнародованы официальные результаты следствия.

Исчезновение в августе прошлого года г-на Завадского, известного журналиста, а в прошлом — личного оператора президента Лукашенко, вызвало громкий резонанс и в Минске, и в Москве. В преступлении сразу же заподозрили политическую подоплеку. Оператор был похищен по дороге в аэропорт Минск-2, куда направлялся, чтобы встретить своего коллегу, обозревателя ОРТ Павла Шеремета, вместе с которым в 1997 году провел некоторое время в белорусской тюрьме по обвинению в незаконном переходе границы. Уже спустя пару месяцев после похищения Завадского по подозрению в причастности к преступлению был задержан бывший сотрудник спецподразделения по борьбе с терроризмом "Алмаз" Валерий Игнатович. Уволенный из спецслужбы в связи с полученной им травмой, Игнатович занял руководящий пост в белорусском отделении РНЕ. С его именем связывают убийство летом прошлого года лидера местного РНЕ Глеба Самойлова. В похищении Завадского обвиняются также Алексей Гуз, Сергей Саушкин и Максим Малик. Последний на момент ареста был действующим офицером "Алмаза". Именно эта четверка, как предполагается, сядет в мае на скамью подсудимых...

Обвинения Игнатовича, Гуза, Малика и Саушкина в киднепинге подтверждаются показаниями соседей Завадского и свидетелей в аэропорту.

По версии следствия, похищение Завадского связано с его профессиональной деятельностью. Работая в Чечне, он получил видеосвидетельства того, что Игнатович сражался против российских войск. Вернувшись из Чечни, Завадский, не называя имени Игнатовича, рассказал об этом в интервью одной из белорусских газет. Опасаясь разоблачения, Игнатович решил избавиться от свидетеля.

О судьбе похищенного оператора прокуратура ничего не сообщает. Неизвестно, жив ли Дмитрий, и, если жив, где он находится. По одной из версий, его вывезли в Чечню, по другой — он убит где-то на трассе Москва–Минск.

Несколько дней назад произошла очередная утечка из правоохранительных органов. (Предыдущая случилась в ноябре прошлого года. Тогда впервые стала известна информация об Игнатовиче и давлении, которое якобы оказывается на следователей. Вскоре после той утечки президент заменил практически всех силовых руководителей). В соответствии с новой информацией, лица, обвиняемые в похищении Завадского, причастны и к другим громким пропажам — бывшего председателя центризбиркома и одного из лидеров оппозиции Виктора Гончара, бывшего министра внутренних дел Юрия Захаренко и бизнесмена Анатолия Красовского. А руководил этой преступной группой командир воинской части СОБР, подполковник МВД Дмитрий Павлюченко. Если дело дойдет до суда над Игнатовичем и его товарищами, возможно, всплывут новые факты, и история с похищениями людей в Беларуси более или менее прояснится.

Юрий АНДРЕЕВ

КАНДИДАТЫ В ПРЕЗИДЕНТЫ ДОГОВОРИЛИСЬ

5 известных политиков —Владимир Гончарик, Семен Домаш, Сергей Калякин, Павел Козловский, Михаил Чигирь — заявили о достигнутой между ними договоренности по координации действий для достижения общей цели — победы на предстоящих президентских выборах.



Владимир Гончарик



Семен Домаш

В этой связи они распространили совместное заявление, в котором изложили свои основные принципы. Это — вывод страны из затяжного кризиса и подъем национальной экономики на основе разработанной общей программы, предусматривающей эффективное использование геополитического положения Беларуси, создание благоприятных условий для производства, инвестиций, развития всех форм собственности. В документе говорится, что победа на предстоящих президентских выборах необходима для "реального повышения благосостояния людей, преодоления бедности и нищеты, надежной социальной защиты пенсионеров, инвалидов, чернобыльцев, учащейся молодежи, помощи семье", а также для "обеспечения прав и свобод граждан; надлежащей борьбы с преступностью; ликвидации чиновничьего беспредела и коррупции, преследования инакомыслящих; реабилитации незаконно осужденных, установления виновных в исчезновении людей". Политики заявили о готовности укреплять местные Советы и органы самоуправления, что приведет к возвращению власти народу. В программе "блока кандидатов" говорится, что ее реализация приведет к развитию взаимовыгодного сотрудничества с Россией "в Союзе двух суверенных государств", к установлению дружественных отношений со странами Европы и всего мира, преодолению международной изоляции Беларуси.

Подписавшие обращение призывают всех граждан Беларуси объединиться ради будущего Родины: "Только вместе мы в силах изменить жизнь к лучшему, обеспечить для каждого возможность зарабатывать и законный порядок для всех".

БелаПАН

БЕЛАРУСКАЯ ЭЛІТА НЕ ХОЧА БОЛЬШ БАЧЫЦЬ ЛУКАШЭНКУ ПРЭЗІДЭНТАМ

86,8 працэнтаў бізнесменаў, палітолагаў, кіраўнікоў мас-медыа як з дзяржаўных, так і з недзяржаўных структур, не хочуць бачыць Аляксандра Лукашэнку прэзідэнтам Беларусі яшчэ на адзін тэрмін.

У той жа час, 22,1 працэнта гатовыя прагаласаваць на будучых прэзідэнцкіх выбарах за Сямёна Домаша. І ягоны рэйтынг паступова расце. Такія вынікі сацыялагічнага апытання Нацыянальнага Інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў, прэзентаванага паслам замежных краін і грамадска-палітычным лідэрам Беларусі ў мінулую пятніцу ў штабкватэры місіі АБСЕ.

У апытанні НІСЭПД прынялі ўдзел звыш 70 беларускіх палісімейкераў, экспертаў, лідараў мас-медыя і бізнесменаў, якія раўнамерна прадстаўлялі як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя сектары. Паводле дадзеных апытання, сярод магчымых кандыдатаў на пасаду Прэзідэнта Беларусі намецілася тройка лідэраў (Сямён Домаш - 22,1 працэнт, Міхаіл Чыгір - 20,6 і Уладзімір Ганчарык - 13,2 працэнты адпаведна), якая істотна адарвалася ад іншых палітыкаў. Прычым прадстаўнікі дзяржструктур хутчэй гатовыя прагаласаваць за Сямёна Домаша, чым за іншых палітыкаў, выстаўленых у рэйтынгу. Займальна, што ў тройку лідэраў не ўваходзіць Аляксандр Лукашэнка, кандыдатуру якога апытаныя, наогул, лічаць не прымальнай.

А весь якім рэспандэнты ўяўляюць сабе будучага прэзідэнта Беларусі. Ягоны партрэт досыць рэзка адрозніваецца ад характарыстык Аляксандра Лукашэнкі. 91 працэнт апытаных, абсалютная большасць, бачаць будучага прэзідэнта краіны, як прыхільніка радыкальных зменаў сённяшняга курса дзяржавы, 88 працэнтаў упэўненыя, што гэта павінен быць чалавек, які будзе прытрымліваецца шматвектарнай знешняй палітыкі, гэта значыць актыўна развіваць стасункі Беларусі не толькі з Расіяй, але і з Еўропай.

У параўнанні з папярэднім апытаннем, у асяродку лідэраў недзяржаўнага сектару істотна ўзрасла падтрымка адзінага кандыдата ад дэмакратычных сіл.

Больш за 60 працэнтаў рэспандэнтаў лічаць, што Беларусі патрэбны незалежны кандыдат і, пажадана, не вайсковец. Адначасова пераважная большасць апытаных, і прадстаўнікі дзяржаўнага сектару тут не выключэнне, не хочуць мець у будучым прэзідэнта-аўтакрата. Як мяркуюць спецыялісты, вялікую ролю тут адыграў горкі досвед жыцця пры сённяшнім кіраўніку Беларусі.

Павел МАЖЭЙКА

Президент Лукашенко провоцирует антирусские настроения в Беларуси

Политика президента Александра Лукашенко способствует росту агрессивного национализма в белорусском обществе. По мнению председателя Белорусского Хельсинкского комитета Татьяны Протько и посла Беларуси в ООН с 1990 по 1994 годы Геннадия Буравкина, такие явления, как вытеснение белорусского языка и внедрение русского, только способствуют антирусским настроениям.

По словам выступившей на пресс-конференции в Москве Татьяны Протько, в Белорусский Хельсинкский комитет постоянно поступают жалобы от граждан. Люди сообщают, что им отказывают в праве писать в документах свое имя по-белорусски, на улицах избивают тех, кто разговаривает на белорусском языке. Одного ребенка, воспитывавшегося в белорусскоговорящей семье и не говорившего по-русски, учителя пытались объявить умственно отсталым. По мнению участников пресс-конференции, все это вызывает в качестве ответной реакции такие экстремистские действия как, например, сжигание российских флагов на митингах оппозиции.

Татьяна Протько и Геннадий Буравкин заявили, что большинство сторонников демократии в Беларуси осуждают "русофобию" и выступают за дружественные и союзные отношения с Россией. Однако белорусская оппозиция не приемлет создания единого государства, поскольку это приведет к поглощению Беларуси Россией. По мнению Геннадия Буравкина, такое объединение повредит и России, поскольку она получит "раковую опухоль" в виде тоталитарного режима.

Агентство ПРИМА

В Беларуси уже десять претендентов на пост президента

На сегодняшний день о своем намерении баллотироваться на пост президента Беларуси заявили десять граждан, заявила в интервью "Интерфаксу" председатель центральной избирательной комиссии этой страны Лидия Ермошина.

Фамилии почему-то не уточнены, но, по подсчетам сведущих людей, кандидатов пока 9, а не 10 — это Чигирь, Гончарик, Домаш, Козловский, Левоневский, Синицын, Гайдукевич, Крыжановский и Лукашенко. Десятый, возможно, пока лишь подразумевается. Как бы там ни было, по словам Лидии Ермошиной, выборы главы Беларуси должны состояться не позднее 27 сентября, однако точную дату голосования республиканский парламент пока не назначил, чтобы не изменять длительность избирательной кампании, определенной законом в три месяца.

Наталья ФУРСОВА

НАВІНЫ МАСТОЎШЧЫНЫ

Вуліца "Камсамольская" змагаецца

Болей як месяц таму назад Луненскі сельсавет прыняў рашэнне аб пераіменаванні вуліцы Камсамольскай у вуліцу імя Элізы Ажэшка.

Аб тым, што сусветнавядомая пісьменніца мела непасрэднае дачыненне да гэтага мястэчка, распавядаў на сесіі савета дэпутат, настаўнік мясцовай школы, кандыдат гістарычных навук Станіслаў Сільвановіч. З яго меркаваннямі пагадзіліся прысутныя дэпутаты і нават старшыня Мастоўскага райсавета Каробка. Такое рашэнне не спадабалася мясцовым камуністам. У знак пратэсту яны сабралі восем подпісаў пенсіянераў. У заяве ў Мастоўскі райвыканкам сцвярджалася, што Камсамольскай вуліца была названа ў гонар скідальскіх падпольшчыкаў, якія былі закатаваны фашыстамі ў гады вайны. Зацікаўленыя бакі сустрэліся ў Мастоўскім райвыканкаме, і яго старшыня Аляксандр Кісялёў засведчыў: паколькі Эліза Ажэшка не пісала ў той час па-беларуску, то варта ў тым разабрацца. Раённае кіраўніцтва прапанавала сельсавету правесці агульны сход жыхароў вуліцы і там высветліць сутнасць праблемы. Сход параіў "камсамольскім" змагарам звярнуцца ў архіў ды там пашукаць дакументы, якія б пацвярджалі, у гонар якіх камсамольцаў атрымала назву гэтая вуліца. А пакуль — вуліца Элізы Ажэшка.

"Свабоднаму прафсаюзу" НЕ МЕСЦА НА СХОДЗЕ

Чыноўнікі і кіраўнікі калгасаў адстаялі свае права прадстаўляць Мастоўскі раён на другім Усебеларускім народным сходзе.


Згодна загадзя распрацаванаму сцэнарыю, больш за 180 прадстаўнікоў прадпрыемстваў, калгасаў і іншых арганізацый, з якіх толькі 30 чалавек склалі простыя рабочыя ды калгаснікі, павінны былі паспешна абраць 12 прадстаўнікоў для ўдзелу ў ІІ Усебеларускім народным сходзе. Пасля выступлення намесніка старшыні райвыканкама Таісіі Мурынай быў зачытаны спіс будучых дэлегатаў, дзе значыліся толькі адны чыноўнікі ды кіраўнікі прадпрыемстваў і калгасаў. Пасля гэтага ўзяў слова старшыня Свабоднага прафсаюза прадпрыемства "Самана плюс" Валерый Яроменчук, які быў абраны на сходзе працоўнага калектыва і запатрабаваў, каб у склад дэлегацыі быў уключаны рабочы, і прапанаваў сваю кандыдатуру. Яго ўключылі ў спіс для галасавання і вымушаны былі змяніць рэгламент сходу. Адкрытае галасаванне спісам замянілі на пайменнае, але на паталенне не пагадзіліся.

За чыноўнікаў галасавалі аднагалосна, Валерый Яроменчук набраў 86 галасоў і не патрапіў у склад дэлегацыі. Па выхаду з залы некаторыя ўдзельнікі сходу ціснулі яму руку і прасілі прабачэння.

Антон МАКЕЙ

Газета Слонімская
3 — 9 траўня 2001г. №18 (204)

СЕМ ТРЫЯДАЎ АЛЕГА ЛОЙКІ



1 траўня нашаму знакамітаму земляку, доктару філалагічных навук, прафесару, члену-карэспандэнту Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі, аўтару шматлікіх кніг паэзіі, прозы, перакладаў, літаратуразнаўчых артыкулаў і падручнікаў Алегу Лойку споўнілася 70. Нарадзіўся ён у 1931 годзе ў Слоніме. Закончыў СШ №1, філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі.

— Алег Антонавіч, раскажаце пра сябе?

— Пра сябе гаварыць цяжка. Усяго не абдымеш, самога сябе атэставаць, характарыстыку даваць — сорам, суб'ектывізм свой пераадолець — немагчыма. Ёсць найсвяцейшая формула: "Хай людзі пра цябе скажуць, хто ты". Але хто я, найлепей ведаю я. Ведаю ўсе закуткі свае душы, ведаю найперш, што са мною было, здаралася, стала маім лёсам. У якіх абставінах, часткова ведаю, а, пэўна, вельмі шмат пра іх не ведаю. А таму, Сяргей, без прэтэнзій на нешта большае хачу прапанаваць сем трыядаў, якія датычаць мяне і майго жыцця.

— Гэта цікава. І што сабой, напрыклад, уяўляе першая трыяда?

— Трыяда першая — трыяда маіх самых значных учынкаў. Яна звязана з тым, што, па-першае, я нарадзіўся, прыйшоў на гэты свет, па-другое, з тым, што закахаўся (у семнаццаць гадоў, усю бяссонную ноч пасля сустрэчы з ёю толькі і думаў, як гэта яе я дасюль не заўважаў, не бачыў, не знаў!). Па-трэцяе, з тым, што дажыў вось аж да сямідзесяці...

— Другая трыяда — гэта, відаць, трыяда Вашых няўдач?

— Так, трыяда другая — маіх няўдач. Першая з іх мяне падпільноўвала на першым курсе філфака БДУ — у другім семестры. Быў люты, 23-га, дзень Савецкай Арміі. Мне далі маё першае камсамольскае даручэнне — прачытаць святочную лекцыю ў калгасе. Едзем у Койданава — Дзяржынскі райкам камсамола. Там мне ўручаюць пуцёўку ў калгас "1 мая". Вяртаюся з Койданава ў Фаніпаль. Вузкакалейкай іду між складаў торфу ва ўпраўленне калгаса. Я ж ведаю амаль на памяць выступленне Сталіна 3 ліпеня 1941 года: "Няхай вас ахінуць славай імёны Неўскага, Суворава, Кутузава!". Ужо прыцемкамі я стукаюся ў дзверы праўлення. Пуста! Кідаюся ў пошукі, хто б мяне прывеціў. Нехта з людзей добрых падказвае: "Старшыня во ў той хаце, на хрэсьбінах...". Іду ў тую хату: далей парога мяне не пускаюць, але з сяней дзверы ў святліцу прыадчыненыя, а за імі — святочны гоман, але не ў гонар Чырвонай Арміі. І вось, пачуўшы гэта, дрыпаю тудою, кудою сюды ішоў. Сцямнела ўжо добра, калі ў Фаніпалі сеў у цягнік, якраз у той вагон, у якім ехалі старшакурснікі. Усе вясёлыя, гаваркія: "Не зрабіў даклада?! А навошта яго было рабіць? Трэба было толькі пячатку падбіць у прадсядацеля!..".

Па тую пячатку я паехаў у Фаніпаль назаўтра раніцай, не думаючы пра даклад, а толькі пра пячатку...

— Алег Антонавіч, я Вас перапыню, бо ведаю, што такіх прыкладаў са свайго жыцця можна прывесці шмат. А ці была ў Вас у жыцці трыяда авацый?

— Адна з іх мяне спаткала ў Маскве, у Калоннай Зале Вялікага Тэатра падчас святкавання там 500-годдзя Францішка Скарыны. Другая мяне спаткала на родным філалагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта — пасля майго пяцігадовага дэканства на гэтым факультэце. А трэцяя авацыя была ў Парыжы на святкаванні 200-х угодкаў з дня нараджэння Адама Міцкевіча. У Маскве я гаварыў па-руску, даклад пра Міцкевіча ў Парыжы чытаў на французскай мове. Гэта, канешне, знакава — беларусец у Маскве, беларус — у Парыжы. Францішак Скарына і Адам Міцкевіч торацць Беларусі дарогу ў шырокі свет!..

— А якая трыяда чацвёртая?

— Чацвёртую трыяду свайго жыцця я бачу пад знакам мужнасці. У 1958 годзе, калі мужнеў, як вучоны, я не пабаяўся сказаць праўды пра псеўданавуковую дысертацыю Васілёнка, які тады прыехаў з Масквы, дзе ў Маскоўскім універсітэце ўзначальваў кафедру літаратур народаў СССР.

